УДК 394.2:791.633

***А. Г. Хаменка,***
*старшы выкладчык кафедры рэжысуры*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», Рэспубліка Беларусь*

# ЭМАЦЫЯНАЛЬНЫ АСПЕКТ РЭЖЫСУРЫ МАСАВЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ

**Анатацыя.** У пачатку XXI ст. павялічылася цікавасць да такіх адгалінаванняў навуковых даследаванняў, як гісторыя эмоцый, эмалогія (эматыялогія), эмацыянальны інтэлект. Новыя формы камунікацыі ўтварылі рэвізію шэрагу семіятычных тэорый. Артыкул прапануе аргументацыю вывучэння студэнтамі творчых спецыялізацый актуальных даследаванняў, якія звязаны з паняццем «эмацыянальны інтэлект». Калі ўлічваць, што эмоцыі з'яўляюцца моцным матыватарам, то гэта вызначае наступнае: арганізацыя сацыяльнай прасторы мастацкімі сродкамі з'яўляецца прыярытэтнай часткай рэжысуры і менеджменту любога масавага мерапрыемства. Аднак інструментарый таго, як абуджаць у слухача (гледача) не толькі пэўныя эмацыянальныя рэакцыі, але і адпаведную на іх рэакцыю, перавядзенне эмацыянальнага стану ў трывалыя пачуцці, пакуль уяўляецца няпэўным. Такія сродкі могуць быць выпрацаваны праз практычны аналіз арганізацыі і правядзення масавых святочных і канцэртных мерапрыемстваў. Выказваецца прапанова ўвесці ў тэзаўрус студэнтаў кафедры рэжысуры паняцце «эмаінжынерынг».

**Ключавыя словы:** эмалогія, эматыялогія, эмодзі, эмацыянальны інтэлект, рэжысёрская эксплікацыя, эма-інжынерынг.

***A. Khamenka,***
*Senior lecturer at the Department of Directing of the Educational Institution*
*"Belarusian State University of Culture and Arts", Republic of Belarus*

# EMOTIONAL ASPECT OF DIRECTING MASS EVENTS

**Abstract.** At the beginning of the 21st century, interest in such branches of scientific research as the history of emotions, emology (ematology), emotional intelligence increased. New forms of communication formed a revision of a number of semiotic theories. The article offers an argument for students to study creative specializations of current research related to the concept of "emotional intelligence". If we consider that emotions are a strong motivator, this determines the following: the organization of social space by

artistic means is a priority part of directing and managing any mass event. However, the tools of how to awaken in the listener (viewer) not only the appropriate emotional reactions, but also to respond creatively to them, translates emotional states into strong feelings, while it seems uncertain. Such tools can be developed through a practical analysis of the organization and conduct of mass celebrations (show) and concerts. It is proposed to introduce the concept of "emo-engineering" in the thesaurus of students of the Department of Directing.

**Keywords:** emology, emotiology, emoji, emotional intelligence, directorial explication, emo-engineering.

У вучэбным працэсе па дысцыплінах «Рэжысура масавых свят», «Рэжысёрская эксплікацыя», «Менеджмент канцэртна-відовішчнай сферы» ды інш., на нашу думку, надзвычай важна ўдзяліць увагу аналізу такога феномена, як эмацыянальны аспект масавага мерапрыемства. Апытанне студэнтаў кафедры рэжысуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (далей – БДУКМ), у якім прынялі ўдзел 50 асоб ва ўзросце 18–30 гадоў, паказала, што 80 % з іх набываюць квіткі на масавыя мерапрыемствы (галоўным чынам, канцэртныя шоу) з мэтай атрымаць эмацыянальныя перажыванні. Каля 70 % асоб маюць мэту далучыцца (актыўна ці пасіўна) да сацыяльнай супольнасці гледачоў–слухачоў. Відавочна, іх матывацыя звязана з жаданнем адчуць эмацыянальныя перажыванні тых асоб, якіх яднае паведамленне («меседж», *message*) артыста, гурту ці калектыву. Не менш за 60 % апытаных адзначаюць важнасць такога складніка, як сацыякультурная прастора, якую фарміруе месца, час і кошт квіткоў на адпаведнае мерапрыемства.

Культуралагічныя даследаванні на тэму эмоцый і пачуццяў у прасторы мастацкіх актаў пашырыліся напрыканцы 70-х – пачатку 80-х гадоў XX ст. Сярод прычын, якія спарадзілі гэту навуковую зацікаўленасць, магчыма адзначыць наступныя: увага да феномена эмацыянальнага стану праз навуковыя адкрыцці ў нейралінгвістыцы; актыўная распрацоўка маркетынгавых тэхналогій на падмурку грунтоўных даследаванняў псіхалогіі пакупніка, гледача, спажыўца. Папулярная літаратура па сацыялогіі і псіхалогіі спрыяла ўстойлівасці інтарэсу да эмацыянальных праяў асоб і супольнасцей у стрэсавых і разняволеных умовах.

На мяжы XX–XXI стст. пачынаецца імклівае развіццё перадачы пісьмовых паведамленняў праз сотавыя сеткі мабільнай тэлефоннай сувязі. Спачатку праз прыёмнікі персанальнага выкліку – пейджары, потым праз тэкставыя паведамленні (SMS), веб-платформы (ICQ) ды іншыя месенджары, якія атрымалі папулярнасць некалькі пазней. Менавіта ў гэты час у тэкставыя паведамленні пачалі актыўна дадаваць знакі грашовых сістэм, зорачкі ды іншыя сімвалы. Практычна адразу знакі прыпынку пачалі выкарыстоўвацца з мэтай адлюстравання эмоцый. Напрыклад, шмат клічнікаў ці пытальнікаў запар, сукупнасць знакаў :-), што вызначае жартоўны стан, ці знак :-( – сумны стан. Заўважым, што гэту сукупнасць знакаў прыпынку тэкставы рэдактар Microsoft Word цяпер аўтаматычна мяняе на сімвалы весялосці і смутку, а напрыклад, WordPad гэтага не робіць.

Сёння ў побытавых паведамленнях знакі адпаведных эмоцый выкарыстоўваюцца ў максімальна спрошчаным выглядзе: ) або (((. Імі карыстаюцца тады, калі тэкставая платформа не дазваляе ўжываць «эмодзі» (*emoji*). Нагадаем, што «эмодзі» – гэта піктаграма, лагатып, ідэаграма або смайлік, убудаваныя ў тэкст. Яны ўжываюцца ў электронных паведамленнях і на вэбстаронках, выконваючы асноўную функцыю – ілюстраваць эмацыянальныя сігналы паведамлення. Такім чынам, новыя формы камунікацыі ўтварылі рэвізію шэрагу semiятычных тэорый.

Як ужо адзначалася, у пачатку XXI ст. павялічылася цікавасць да такіх адгалінаванняў навуковых даследаванняў, як гісторыя эмоцый, эмалогія (эматыялогія), эмацыянальны інтэлект. Адзначым, што для тых, хто арганізуе і рэжысіруе масавыя мерапрыемствы, важна бачыць сувязь між кантэкстуалізацыяй сацыяльнага складніка і канструяваннем эмоцый. Гэтыя думкі структуравана прадставіў Уільям Рэдзі ў сваёй манаграфіі «Навігацыя пачуццяў: межы для гісторыі эмоцый» (William M. Reddy «The Navigation of Feeling»). У прапанаванай канцэпцыі «эмацыянальных рэжымаў» студэнтам і выкладчыкам рэжысуры трэба звярнуць увагу на тыя разважанні аўтара, якія тычацца дэтэрмінацыі эмацыянальных станаў грамадства і выбару індывідам межаў [3, с. 30–39]. На падставе гэтых даследаваняў можна разважаць пра такую з’яву, як эма-

інжынерынг (канструяванне эмоцый). Мэта эма-інжынерынгу – стварэнне каналаў для прадказальнага руху эмоцый у трывалыя пачуцці. Для рэжысёраў, прадзюсараў, сцэнарыстаў і драматургаў гэта сфера выглядае вельмі прывабна і актуальна.

Для таго, каб больш грунтоўна разважаць пра канструяванне эмоцый, неабходна звярнуць увагу на канцэпцыю сацыяльнага і эмацыянальнага інтэлекту. На наш погляд, зручную для рэжысёраў структурацыю канцэпцыі сацыяльнага інтэлекту (табліцы) прапанавала Т. В. Філіпоўская ў сваёй працы [1, с. 5–7].

Эмацыянальны інтэлект (*Emotional intelligence, EI*) – здольнасць чалавека распазнаваць эмоцыі, разумець намеры, матывацыю, уласную і партнёраў [2]. З EI звязана здольнасць эфектыўнага асэнсавання эмоцый – пострэфлексія. Неэфектыўнасць традыцыйных інтэлектуальных тэстаў для адлюстравання патэнцыялу лідарскіх і менеджарскіх якасцей патрабавала тлумачэння. Паняцце эмацыянальнага інтэлекту з’явілася ў працэсе асэнсавання гіпотэзы аб тым, што менавіта паспяховыя людзі, здольныя да эфектыўнага ўзаемадзеяння з іншымі, карыстаюцца перш за ўсё эмацыянальнымі сувязямі. Яны маюць здольнасці сітуатыўна дэманстраваць уласныя эмоцыі і рэагаваць на эмацыянальныя праявы партнёраў. Гэта падобна на інтэлектуальны кантроль над эмоцыямі, які дазваляе свядома пераводзіць іх у пачуцці. Зразумела, што выбуховую эмацыянальную рэакцыю на нейкі выклік кантраляваць надзвычай складана. Аднак кагнітыўную аператыўную рэакцыю на эмацыянальны ўсплеск кантраляваць магчыма.

Заняткі са студэнтамі прадэманстравалі, што значны інтарэс і актыўнае жаданне прымяніць тэорыю на практыцы выклікаюць наступныя тэмы:

1. Феномен папулярнасці эмацыянальных сэмплаў.
2. Тэхналогіі вымагання адпаведнага эмацыянальнага стану.
3. Устойлівыя/неўстойлівыя гукі і рытмы – сувібрацыя эмоцый.

Калі ўлічваць, што эмоцыі з’яўляюцца моцным матыватарам, то гэта вызначае наступнае: арганізацыя сацыяльнай прасторы мастацкімі сродкамі з’яўляецца прыярытэтнай часткай рэжысуры і менеджменту любога масавага мерапрыемства. Аднак інструментарый таго, як не толькі абуджаць у слухача (гледача) адпаведныя эмацыянальныя рэакцыі, але і стваральна

на іх рэагаваць, пераводзіць эмацыянальны стан у трывалыя пачуцці, пакуль адсутнічае. Дастаткова прыгадаць, што разважанні наконт справядлівасці, абавязкаў, сумлення, гонару, волі, дабрыні і ўзаемадапамогі абапіраюцца на пачуцці, якія справакавалі шматразова перажытыя эмоцыі: спачуванне, удзячнасць, жах, радасць і збянтэжанасць. Мы ведаем, што шматразова перажытыя эмоцыі фарміруюць трывалае пачуццё. І трываласць пачуцця падмацоўваецца ізноў эмоцыямі. Калі ўлічваць, што ўстойлівае пачуццё – важнейшы матыватар творчых і сацыяльных працэсаў, важна зразумець, як, у якой паслядоўнасці, у якім сацыяльным асяроддзі трэба перажыць эмацыянальныя станы для фарміравання адпаведнага пачуцця.

Падобныя пытанні і адказы, на наш погляд, патрабуюць грунтоўнага вывучэння, у першую чаргу, ва ўстановах вышэйшай адукацыі мастацкага профілю. Гіпотэза аб тым, што асабістую сістэму каштоўнасных прыярытэтаў чалавека фарміруе якраз паслядоўнасць перажытых ім эмоцый, якія трансфарміраваліся ва ўстойлівыя пачуцці, здаецца нам вельмі важнай. Іншымі словамі, самасвядомасць – аналітычны ключ эмацыянальнай памяці. Крытыка або рэвізія гэтай гіпотэзы праз практычны досвед спецыялістаў па арганізацыі масавых мерапрыемстваў (сцэнарыстаў, рэжысёраў, менеджараў) дазволіць павялічыць эфектыўнасць іх падрыхтоўкі і павысіць прафесійныя і асобасныя кампетэнцыі.


1. *Филипповская, Т. В.* Знание и социальный интеллект: социологический подход к осмыслению взаимосвязи / Т. В. Филипповская // Изв. Уральск. гос. экон. ун-та. – 2012. – № 6 (44). – С. 5–10.

2. *Dhani, Priyam.* Emotional Intelligence [Electronic resourse] / Priyam Dhani, Tanu Sharma. – Mode of access: https://www.researchgate.net/publication/305815636_EMOTIONAL_INTELLIGENCE_HISTORY_MODELS_AND_MEASURES. – Date of access: 12.12.2021.

3. *Reddy, W. M.* The Navigation of Feeling / W. M. Reddy. – North Carolina: Cambridge Univ. Press., 2001. – 370 p.